DOI: 10.15290/bb.2024.16.14

***Halina Twaranowicz***
Uniwersytet w Białymstoku
email: belsk2009@yandex.by
ORCID: 0000-0002-6895-9010

# Беларуска-польскае культурнае памежжа

**Рэцэнзія:** А.А. Брусевіч, *Беларуская і польская паэзія другой паловы XI – пачатку XX ст.: станаўленне і дыялог мастацкіх парадыгм. Манаграфія*, пад навук. рэд. праф. А.І. Бельскага, Гродна 2024, 303 с.

## Belarusian-Polish Cultural Border

**Review**: А.А. Брусевіч, *Беларуская і польская паэзія другой паловы XI – пачатку XX ст.: станаўленне і дыялог мастацкіх парадыгм. Манаграфія*, пад навук. рэд. праф. А.І. Бельскага, Гродна 2024, 303 с.

Ужо першая навуковая праца Анатоля Брусевіча, а менавіта кандыдацкая дысертацыя *Фактары беларускай культуры ў творчасці Адама Міцкевіча віленска-ковенскага перыяду (1815–1823)*, напісаная пад навуковай апекай светлай памяці прафесар С.П. Мусіенка і абароненая ў 2004 годзе, засведчыла, што ў беларускае міцкевічазнаўства ўвайшоў таленавіты, кампетэнтны даследчык. Трэба падкрэсліць, што і вельмі ж патрабавальны да сябе. Кандыдацкая дысертацыя А. Брусевіча пабачыла свет праз тры гады ў сціплым жанры дапаможніка, з'яўляючыся аднак па змесце цалкам арыгінальным навуковым даследаваннем – адным з першых у Беларусі, цалкам прысвечаных менавіта творчасці аўтара *Пана Тадэвуша.* Далейшае асэнсаванне А. Брусевічам спадчыны класіка (як напрыклад, артыкул *Адам Міцкевіч у беларускім культурным каноне*, "Białorutenistyka Białostocka" 2011, т. 3), а таксама плённая ўвага даследчыка да культурнага кантэксту XIX–XX стст. успрымаліся як важкі задзел, працэс стварэння важкай працы.

І вось нарэшце пабачыла свет сапраўды фундаментальная манаграфія А. Брусевіча, у якой "разглядаюцца асаблівасці суадносін паміж мастацкімі парадыгмамі беларускай і польскай паэзіі другой паловы XIX – пачатку XX ст., асэнсоўваецца феномен міжлітаратурнага ўзаемадзеяння, які ўзнік на беларуска-польскім культурным памежжы і б я р э с в о й п а ч а т а к з т в о р ч а с ц і А. М і ц к е в і ч а (выдзелена – *Г. Т.*), яскрава праяўляецца ў мастацкім мысленні паэтаў наступных пакаленняў: прадстаўнікоў другой хвалі рамантызму У. Сыракомлі, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, В. Каратынскага, А. Вярыгі-Дарэўскага, Г. Пузыні і інш., пострамантыкаў А. Асныка, Ф. Багушэвіча, рэалістаў М. Канапніцкай і Я. Лучыны, польскіх мадэрністаў А. Лянгэ, Т. Міціньскага, З. Налкоўскай і інш. Значная ўвага надаецца дыфузійным з'явам і мадэрнізацыйным працэсам у паэзіі Беларусі і Польшчы акрэсленага перыяду", – гаворыцца ў лапідарнай анатацыі да манаграфіі.

Да ўважлівага, усебаковага разгляду феномену беларуска-польскага культурнага памежжа, месца ў ім А. Міцкевіча і ўзгаданых паэтаў беларускае літаратуразнаўства па прычыне самых розных як аб'ектыўных сацыяльна-гістарычных, так і суб'ектыўных, можна сказаць, асабістых варункаў, звярнулася адносна нядаўна – у другой палове XX стагоддзя. І сапраўды, як слушна падкрэсліў ужо ў новым мілеініуме Мікола Хаўстовіч, без аналізу польскамоўнага даробку літаратараў, якія жылі на беларускай зямлі і тварылі дзеля народу гэтага краю, немагчыма асэнсаванне літаратурнай спадчыны Беларусі XIX стагоддзя, уласна немагчыма напісанне паўнавартаснай гісторыі новай беларускай літаратуры. Архіўным збіраннем, часта па крупіцах, і асэнсаваннем матэрыялу XIX стагоддзя актыўна займаліся Алег Лойка, Генадзь Кісялёў, Віктар Каваленка, Адам Мальдзіс, Кастусь Цвірка, Алесь Яскевіч, Уладзімір Казбярук, Уладзімір Мархель і інш. Асабліва інтэнсіўна, здзіўляючы сваёй даследчай прадуктыўнасцю якраз у справе вяртання літаратурнай спадчыны шмат гадоў працуе на гэтай дзялянцы Мікола Хаўстовіч.

Праўда, у навуковым асяроддзі нечакана сталі з'яўляюцца сцвярджанні аб перабольшанні нацыянальнага наратыву, аб жаданні даследчыкаў ствараць ідэалізаваныя канцэпцыі літаратурнага развіцця, нават аб "шкоднай" беларусацэнтрычнасці. Такія своеасаблівыя заклікі да "цвярозасці" падыходаў сваёй унутранай прыродай сыходзяцца

з завышанай, найчасцей хваравітай патрабавальнасцю да свайго ўласнага дзіцяці, якое мусіць быць тут і зараз, адразу і заўсёды, нягледзячы ні на што, бездакорным ва ўсім. З другога боку, відаць, існаванне такога "аб'ектыўнага" падыходу, пэўнага "плюралізму" сведчыць і аб нармальным працэсе, забяспечаным шматгадовай плённай працай некалькіх пакаленняў літаратуразнаўцаў. Дзейсным жа аргументам, адказам на, відаць, па-свойму і шчырую крытыку, прынамсі праблем, звязаных з XIX стагоддзем, з'яўляецца далейшая распрацоўка, паслядоўнае вывучэнне асаблівасцей такога ўнікальнага феномену ў культурнай прасторы, як беларуска-польскае памежжа другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзяў Анатолем Брусевічам.

Відавочна, што найбольш адэкватнай падрыхтоўкі, шляху да асэнсавання вызначальных тэндэнцый, асаблівасцей суадносін паміж мастацкімі парадыгмамі беларускай і польскай паэзіі, чым быў пройдзены А. Брусевічам, немагчыма ўявіць. Пры тым дарэчы заўважыць, што спасціжэнне генія Адама Міцкевіча, яго магутнага сілавога творчага, духоўнага поля, без перабольшання, з'яўляецца абавязковай умовай для паспяховай працы кожнага даследчыка літаратуры беларуска-польскага памежжа. Невыпадкова А. Брусевіч падкрэслівае:

> Разбіваючы межы-барыкады ўмоўнасцей і стэрэатыпаў, спадчына А. Міцкевіча ўжо больш за два стагоддзі ўплывае на творчую свядомасць мастакоў у сусветным маштабе. Уплывае непасрэдна і апасродкавана – праз наследаванні, пераклады і інтэрпрэтацыі. Так ці інакш, але менавіта А. Міцкевіч і па сёння выступае ў якасці актыўнага складніка еўрапейскага літаратурнага працэсу. Станаўленне беларускай і польскай паэзіі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя ў значнай ступені адбывалася пад патранатам особы гэтага таленавітага, вялікага майстра слова і цэлага шэрага эстэтычных ідэй і поглядаў, увасобленых у яго мастацкай творчасці (18).

Манаграфія А. Брусевіча складаецца з чатырох глаў, што абумоўлена этапамі станаўлення беларуска-польскіх літаратурных сувязей. Ва ўступнай першай главе "Беларуская і польская паэзія другой паловы XIX – пачатку XX ст.: параўнальна-гістарычны, тыпалагічны і кантэкстуальны аспекты" акрэсліваецца эстэтычная прастора беларуска-польскага культурнага памежжа, удакладняецца месца А. Міцкевіча ў працэсах станаўлення паэзіі абодвух народаў. Слушна звяртаецца

ўвага на тое, што беларуская культура сталася ідэйна-стваральным падмуркам рамантычнай школы, закладзенай А. Міцкевічам. Беларускі фальклорны субстрат, рэалізаваны ў творчасці паэта праз багатае выкарыстанне сюжэтаў, матываў і вобразаў, быў уключаны ў парадыгму рамантычнай паэтыкі і арыгінальнага аўтарскага наратыву.

У другой главе “Беларуская і польская паэзія ў перыяд станаўлення і эвалюцыі рамантызму (1830-я пачатак 1860-х гг.)” А. Брусевіч, звярнуўшыся да творчасці Яна Баршчэўскага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Габрыэлі Пузыні, Арцёма Вярыгі-Дарэўскага, Уладзіслава Сыракомлі і Вінцэнта Каратынскага, прыходзіць да высновы, што іх творчасць у поўнай меры недаацэнена як іх сучаснікамі, так і наступнымі пакаленнямі даследчыкаў. Уяўляе ж сабой пры тым значную і арыгінальную старонку “ў прыгожым пісьменстве эпохі рамантызму, а таму вымагае новага прачытання і асэнсавання ў аспектах станаўлення і дыялогу мастацка-эстэтычных парадыгм. З улікам тых ідэйна-творчых і грамадскіх працэсаў, якія адбываліся на беларуска-польскім культурным памежжы” (128). Мастацкая свядомасць названых аўтараў фарміравалася пад аднaчасовым уплывам індывідуальных і нацыянальных варыянтаў мастацка-светапоглядных канцэпцый рамантызму, а таксама пры асаблівым уздзеянні творчасці А. Міцкевіча і, як падкрэслівае А. Брусевіч:

> (...) разам з тым важнай асаблівасцю эвалюцыі рамантычнага светапогляду прадстаўнікоў беларускай і польскай паэзіі другой паловы XIX ст. з’яўляецца мэтанакіраванае пераадоленне народнай эстэтыкі і паслядоўнае збліжэнне з агульнаеўрапейскай мастацкай парадыгмай” (128). У выніку спалучэння маральна-этычных традыцый хрысціянства і беларускай народнай культуры, інтэграцыі ў кантэкст еўрапейскага рамантызму была створана арыгінальная канцэпцыя “лірычнага героя рамантычнага тыпу: шлях гэтага героя да ідэалу нярэдка ляжыць праз маральнае ўдасканаленне, адданае служэнне Богу, любоў да Айчыны і каханне як найвышэйшую форму праяўлення чалавечага ў чалавеку (128).

Асаблівасці паэтычнай творчасці Адама Асныка, Францішка Багушэвіча, Марыі Канапніцкай і Янкі Лучыны разглядаюцца ў трэцім раздзеле “Беларуская і польская паэзія ў перыяд пострамантызму (1863–1889 гг.)”. На фарміраванне творчай індывідуальнасці гэтага перыяду моцны ўплыў аказала рэчаіснасць, сацыяльна-грамадскія

абставіны і найперш Студзеньскае паўстанне 1863–1864 гадоў. Як дакладна адзначае аўтар манаграфіі, параза паўстання знайшла рознае выяўленне ў светапоглядзе паэтаў. Так, у А. Асныка і Ф. Багушэвіча і іншых удзельнікаў змагання "з'явілася глеба для мастацкага песімізму, трагізму і катастрафізму, а ў іншых (М. Канапніцкая, Я. Лучына і інш.) – надзея на поспех у пошуках рацыянальнага выйсця з няпростых гістарычных абставінаў. Эвалюцыя творчай свядомасці кожнага з прадстаўнікоў беларуска-польскага літаратурнага памежжа ў тагачасны перыяд мела сваю адметнасць і адрозненні" (183). Распачаўся новы этап у развіцці літаратуры, калі побач з рамантычнай традыцыяй з'яўляецца рэалістычнае адлюстраванне рэчаіснасці, хоць рэзкага пераходу не адбываецца, што знаходзіць выяўленне ў вобразе лірычнага героя, які "не аптыміст-пазітывіст, што зацята верыць у перамогу цвярозага розуму над эмоцыямі і прагне любым спосабам выкрыць прыроду сацыяльнага зла, а, хутчэй, стомлены рамантык, які гатовы ў адзіночку супрацьстаяць заганнаму свету, аднак адкрыта дэманстраваць сваю гатоўнасць не жадае (183). Амаль цалкам адышлі ад ідэйна-эстэтычнай парадыгмы рамантызму М. Канапніцкая і Я. Лучына. На думку А. Брусевіча, іх месца і роля ўнутры беларускай культурна-гістарычнай прасторы дасюль застаюцца не зусім акрэсленымі.

Ідэйна-эстэтычныя, мастацкія пошукі звычайна абвастраюцца на мяжы стагоддзяў, прынамсі, пацверджаннем таму працэсы, што адбываліся ва ўсёй еўрапейскай літаратуры, мастацтве напрыканцы XIX – на пачатку XX стагоддзяў. У заключнай, чацвёртай главе сваёй манаграфіі А. Брусевіч канцэнтруецца якраз на гэтым складаным перыядзе. Глава "Беларуская і польская паэзія ў перыяд мадэрнізацыі мастацкай свядомасці (1890–1918)" складаецца з двух важкіх раздзелаў: "Ад Антонія Лянгэ да Максіма Багдановіча: дыскурс мастацкага касмапалітызму, стылёвыя навацыі" і "Сімвалісцкія, экспрэсіяністычныя, сюррэалістычныя і іншыя наватарскія тэндэнцыі ў паэзіі «Маладой Польшчы» і творчасці паэтаў-нашаніўцаў". У даследаванні падкрэсліваецца, што і польскія, і беларускія паэты гэтага перыяду "шукалі розныя спосабы пашырэння існуючых творчых канонаў і эстэтычных межаў, што, зрэшты, не пярэчыла агульнай стратэгіі нацыянальнага адраджэння, паколькі ўмацоўвала "сваё", самабытнае, пацвярджаючы за кошт "чужога" яго высокую вартасць, ролю і месца ў сусветнай культурнай

парадыгме і агульначалавечай сістэме каштоўнасцей. На беларуска-польскім літаратурным памежжы ўзнік адмысловы дыскурс мастацкага касмапалітызму, выкліканы жаданнем асобных творцаў (А. Лянгэ, М. Міціньскага, Я. Купалы, М. Багдановіча, Г. Леўчыка і інш.) разамкнуць у прыгожым пісьменстве кола "самапаўтарэння", аднастайнасці, стэрэатыпнага мыслення, зацыкленага выключна на ўнутраных тэмах і праблемах" (268–269). І далей цалкам слушна заўважаецца:

> Галоўны парадокс заключаецца ў тым, што мастацкі касмапалітызм беларускіх і польскіх паэтаў, апрача іншага, не замінаў, не перашкаджаў увасабленню пачуцця патрыятызму, паколькі нязменным "цэнтрам сусвету" для іх заставалася радзіма (геаграфічная, культурная, ментальная), яе рэаліі, яе рэчаіснасць (269).

Гэтае ўвасабленне пачуцця патрыятызму, несумненна, трывала на ідэйна-эстэтычнай пераемнасці, сувязі з традыцыяй славянскага рамантызму, што забяспечвала цэласнае развіццё творчай індывідуальнасці.

У манаграфіі Анатоля Брусевіча, як і было заяўлена ва Уводзінах, сапраўды на належным высокім узроўні прааналізаваны асаблівасці суадносін паміж мастацкімі парадыгмамі беларускай і польскай паэзіі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзяў. Варта дадаць, што тонкасць аналізу паэтычных тэкстаў у манаграфіі забяспечваецца, апрача літаратуразнаўчай, прафесесійнай кампетэнтнасці даследчыка, тым, што А. Брусевіч, як паэт і перакладчык, пераствaрыў на беларускую мову паасобныя творы А. Міцкевіча, А. Лянгэ, Т. Міціньскага, В. Шымборскай і інш. І, безумоўна, манаграфія "Беларуская і польская паэзія другой паловы XI – пачатку XX ст.: станаўленне і дыялог мастацкіх парадыгм" мусіць быць абаронена як доктарскае дысертацыйнае даследаванне.